*А. У. Любы*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск

*A. Liuby*
Belarusian State University, Minsk

**УДК 930.1**

# ДАСЛЕДЧЫЦЫ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў ЦЕНІ ДЗЕЙНАСЦІ СВАІХ МУЖОЎ

# WOMEN RESEARCHERS OF THE GDL HISTORY ARE IN THE SHADOW OF THEIR HUSBANDS' EFFORTS

*У артыкуле разглядаецца шэраг біяграфій жанчын-даследчыц гісторыі Вялікага Княства Літоўскага з XX ст., якія сфарміраваліся як навукоўцы ва ўніверсітэцкіх асяродках Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, пераважна ў Віленскім універсітэце Стэфана Баторыя, пакінулі свой след у гістарычнай навуцы Польскай Народнай Рэспубліцы і аб'яднаны агульным лёсам – быць у цені вядомых мужоў-даследчыкаў.*

*Ключавыя словы: Вялікае Княства Літоўскае; гістарыяграфія XX ст.; жаночыя біяграфіі.*

*The article examines a number of women researchers biographies, who studed the history of the Grand Duchy of Lithuania from the 20th century and who were formed as scientists in the university landscape of Central and Eastern Europe, mainly in the Vilnius University of Stefan Batory, left their mark in the historical science of the Polish People's Republic, and were united common fate to be in the shadow of famous research husbands.*

*Keywords: Grand Duchy of Lithuania; historiography of the 20th century; women's biographies.*

У 2015 г. Генеральная асамблея Арганізацыі Аб'яднаных Нацый прыняла рашэнне пра абвяшчэнне Міжнароднага дня жанчын і дзяўчын у навуцы – 11 лютага кожнага года. Пытанне, якое павінна ўздымацца перад сусветнай супольнасцю, тычыцца «навукі і гендарнай роўнасці». І хаця «жаночая складаючая» ў гуманітарных навуках агулам вышэй за шэраг іншых навуковых накірункаў, але ў прыватнасці ў гістарычнай навуцы колькасць даследчыц з навуковымі ступенямі непараўнальна меньшая за «мужчынскую». Аднак XX ст., якое з'яўляецца безумоўна стагоддзем навуковай эмансіпацыі жанчын, высвеціла яшчэ адну цікавую акалічнасць, якую можна акрэсліць як сыход у цень – у цень навуковай творчасці і кар'еры ўласных мужоў. У гістарыяграфіі гісторыі Вялікага Княства Літоўскага маем такія прыклады, абумоўленыя не ў малой ступені і міграцыйнымі працэсамі Другой сусветнай вайны.

Акадэмічныя даследаванні па гісторыі Вялікага Княства Літоўскага пачынаюць праводзіцца з пачатку XIX ст. у Віленскім імператарскім універсітэце ці на пасяджэннях Варшаўскага гістарычнага таварыства. Такія даследаванні і ўзнятыя на іх праблемы былі спробай знайсці альтэрнатыўную

гісторыю для ўсходнееўрапейскага рэгіёна, альтэрнатыву гісторыі кантынентальных імперый. Падобныя высновы рабіў і стваральнік першага ўласна ВКЛаўскага наратыву Іахім Лелявель [1]. Аднак шырокая цікавасць да праблемы Вялікага Княства Літоўскага насамрэч праявілася толькі на мяжы XIX і XX стст. Ва ўніверсітэтах Масквы, Кіева, Львова і Кракава з'явілася літаратура па гісторыі дзяржавы ў Сярэднявеччы і раннім Новым часе – Вялікага Княства Літоўскага ці Руска-літоўскай дзяржавы.

Цікавасць да тэмы Вялікага Княства з боку даследчыкаў-пазітывістаў грунтуецца на шырокім спектры крыніц, частка з якіх была выяўлена і актыўна публікавалася ў XIX – пачатку XX ст. Яны паходзяць са збораў Львова, Кракава, Вільні, Масквы і іншых цэнтраў рэгіёна Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. У асноўным гэта дакументы трох відаў: карэспандэнцыя (напрыклад, вялікага князя Вітаўта і караля Уладзіслава-Ягайлы), актавыя крыніцы (з Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага канца XV–XVI ст.), дзённікі і асабістыя матэрыялы з магнацкіх архіваў XVIII ст. (Радзівілаў, Тызенгаўзаў, Агінскіх, Храптовічаў і інш.).

У 1919–1921 гг. стварылася і рэканструявалася ўніверсітэцкая сістэма Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, як у Польшчы, так і ў Беларусі, Літве, Украіне. Галоўным універсітэцкім цэнтрам даследаванняў гісторыі Вялікага Княства Літоўскага ў міжваенны перыяд становіцца Віленскі ўніверсітэт Стэфана Баторыя (у Савецкай Беларусі ў 1920-я гг. такім цэнтрам быў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт) [2]. Пры Віленскім універсітэце ў 1920-я гг. быў заснаваны профільны навуковы часопіс «Atheneum Wilenskie» [3]. У Вільні ж працавалі Таварыства аматараў навук [4] і Інстытут Усходняй Еўропы [5]. З 1920-х гг. да працы навуковых асяродкаў былі прыцягнуты прафесары са Львова і Кракава. Але галоўнымі стваральнікамі краязнаўчых даследаванняў былі ўласна выпускнікі ўніверсітэта, якія паходзілі пераважна з Віленшчыны, Гарадзеншчыны і Берасцейшчыны.

Варта адзначыць, што велізарную ролю ў стварэнні акадэмічнай прасторы для даследавання гісторыі Гарадзеншчыны і Віленшчыны часоў Вялікага Княства Літоўскага адыграла пісьменніца Элаіза Ажэшка, якая была мецэнатам і ідэйным натхняльнікам для мясцовай навуковай інтэлігенцыі.

Усходняя Еўропа і яе акадэмічная супольнасць былі гатовыя да эмансіпацыі жанчын, да жаночага прыходу ў гістарычную навуку, да вывучэння палітычнай і эканамічнай гісторыі. Сярод выпускнікоў Віленскага ўніверсітэта Стэфана Баторыя за дваццаць год можна прыгадаць некалькі дзясяткаў даследчыц гісторыі Вялікага Княства Літоўскага [6; 7].

Аднак падзеі 1939 і 1940 гг., а таксама палітычныя змены ва Усходняй Еўропе пасля Другой сусветнай вайны прывялі да ліквідацыі віленскага ўніверсітэцкага асяродку і пераезду навукоўцаў у іншыя навуковыя цэнтры. Многія не змаглі знайсці сабе месца сярод акадэмічных даследчыкаў і ўніверсітэцкіх выкладчыкаў і пакінулі прафесію.

Аднак створаная даследчыцкая школа Вялікага Княства Літоўскага праявіла сябе ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе ў другой палове XX ст.

Гэта знайшло адлюстраванне ў развіцці даследаванняў па гісторыі Вялікага Княства і Усходняй Еўропы ў Польскай Народнай Рэспубліцы. І жаночы складнік у рэтрансляцыі тут вельмі важны. Хаця мускуліннасць у навуковай карпарацыі даследчыкаў гісторыі Вялікага Княства Літоўскага (ды і не толькі) лічылася ў другой палове XX ст. нормай.

Дазволім сабе некалькі прыкладаў навуковых біяграфій, праз якія хацелася б праілюстраваць самастойны шлях навукоўцаў-жанчын у акадэмічным асяроддзі і адначасова іх адданасць ідэі адкрыцця сваёй гісторыі ў гісторыі Вялікага Княства Літоўскага.

Безумоўна, на першым месцы павінна быць біяграфія доктара гістарычных навук Мар'і Лаўмянскай-Плацкоўскай (Marja Łowmiańska-Plackowska, 1899–1961). Яна была жонкай і аднадумцам прафесара Хенрыка Лаўмянскага ад 1925 г. Як і яе муж, Мар'я Плацкоўская была выпускніцай Віленскага ўніверсітэта Стэфана Баторыя ў другой палове 1920-х гг. Там жа ў 1931 г. абараніла дысертацыю і атрымала доктарскую ступень за даследаванне «Вільня перад маскоўскім нападам 1655 г.» [8]. Прымала актыўны ўдзел у праектах па вывучэнні гісторыі гарадоў Вялікага Княства Літоўскага (пад навуковым кіраўніцтвам Казіміра Хадыніцкага і Хенрыка Лаўмяньскага), вывучала гарадскую геральдыку Вялікага Княства Літоўскага, этнічны склад віленскіх цэхаў і інш. [9–11]. У 1945 г. разам з мужам выехала з савецкай Вільні ў Торунь і Познань. Там працавала настаўніцай гісторыі і польскай мовы ў сярэдняй школе.

У познанскі перыяд жыцця сям'і Лаўмянскіх пані Марыя рэдагавала рукапісы работ мужа па гісторыі Вялікага Княства Літоўскага, большасць тэкстаў з якіх паходзілі яшчэ з віленскага жыцця. Пасля яе смерці ў 1961 г. прафесар Лаўмянскі адмовіўся публікаваць сваю працу па гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. А асноўныя яго працы (напрыклад, «Палітыка Ягелонаў») выйшлі толькі пасля смерці самога прафесара пад рэдакцыяй яго вучняў Марцэлія Космана, Кшыштафа Пяткевіча, Артура Кіяса, Станіслава Александровіча, Рафала Віткоўскага ў канца 1980-х – сярэдзіне 2000-х гг. [7; 12–14].

Творчы дуэт гісторыкаў добра апісалі прафесары Станіслаў Александровіч і Рафал Віткоўскі ў калектыўнай манаграфіі, прысвечанай сям'і Лаўмянскіх «Дзве доктарскія ступені Віленскага ўніверсітэта Стэфана Баторыя» [15].

Наступнай нашай гераіняй будзе Ванда Звольская, у дзявоцтве Мацэновіч (Wanda Zwolska z domu Macenowiczów, 1913–1979). Яе мужам быў Багуміл Звольскі, доктар філасофіі, прафесар, які займаўся гісторыяй Вялікага Княства Літоўскага, уласна гісторыяй Рэфармацыі на беларускіх і літоўскіх землях.

Ванда Звольская пачынала свой навуковы шлях у Віленскім універсітэце Стэфана Баторыя пад кіраўніцтвам прафесара Станіслава Касцялкоўскага. У 1931 г. абараніла магістарскую дысертацыю на тэму «Смерць Эрнэста Годфрыда Гродка» («Śmierć Ernesta Godfryda Grodka»). Пасля 1945 г.

пераехала ў Лодзь. З 1950 г. выкладала методыку выкладання гісторыі ў Лодзьскім універсітэце, дзе ў 1963 г. абараніла доктарскую дысертацыю па гісторыі адукацыі [16; 17].

Яе калегай па семінары прафесара Касцялкоўскага была Марыя Пуцятава, у дзявоцтве Багдановіч (Maria Puciatowa z Bohdanowiczów, 1901–1982). Выпускніца гістарычнага факультэту ў Віленскім універсітэце Стэфана Баторыя ў 1928 г. абараніла доктарскую дысертацыю на тэму «Гісторыя Літоўскай скарбавай камісіі ў апошнія пятнаццаць гадоў панавання Станіслава Аўгуста» («Dzieji Komisji Skarbowej Litewskiej w ostatnim piętnastoleciu panowania Stanisława Augusta») пад навуковым кіраўніцтвам Станіслава Касцялкоўскага. Публікавала работы па гісторыі канфедэрацый у Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст. на землях Вялікага Княства Літоўскага [18].

У 1929–1939 гг. Марыя Пуцятава працавала асістэнтам у Віленскім універсітэце Стэфана Баторыя. І як многія з яе калег, хто перажыў Другую сусветную вайну, вымушана была эміграваць. З верасня 1946 г. яна становіцца супрацоўніцай, намеснікам дырэктара, а з 1955 па 1973 г. дырэктарам бібліятэкі ў Торуньскім універсітэце Мікалая Каперніка. Дзякуючы яе намаганням бібліятэка ўніверсітэта папоўнілася фондамі прыватных бібліятэк, у тым ліку фондаў прафесуры Віленскага ўніверсітэта, матэрыяламі па гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. Гэта відавочна прадстаўляла магчымасць для вывучэння гісторыі як самога Вялікага Княства, так і ўсходнееўрапейскага рэгіёна ў Торуні [19].

Яе мужам быў гісторык Павел Пуцята з Віцебска. Таксама спецыяліст па гісторыі Вялікага Княства Літоўскага, а таксама Полаччыны і Віленшчыны ў XIX ст. Займаўся гісторыяй падзелаў Рэчы Паспалітай, складам і дзейнасцю прадстаўніцтва на сейме падчас паўстання 1830–1931 гг.

Яшчэ адна даследчыца гісторыі Вялікага Княства Літоўскага – Ганна Крыстына Калянкевіч-Міровіч (Anna Krystyna Kalenkiewicz-Mirowiczowa, 1903–1967), таксама выпускніца гістарычнага факультэта Віленскага ўніверсітэта Стэфана Баторыя, студэнткай прафесара Касцялкоўскага. У 1927 г. пад яго навуковым кіраўніцтвам абараніла магістарскую дысертацыю на тэму «Адносіны літоўскіх соймікаў у пытанні падзення Антонія Тызенгаўза» («Stanowisko sejmików litewskich wobec upadku Antoniego Tyzenhauza»). У 1933 г. выйшла яе манаграфія «Распад партыі Тызенгаўза пад уплывам літоўскіх соймікаў» («Rozkład partii Tyzenhauza na tle sejmików litewskich») [20; 21].

Мужам Ганны Калянкевіч-Міровіч быў Анатоль Міровіч (1903–1996), прафесар Варшаўскага ўніверсітэта, загадчык кафедры рускай філалогіі, мовазнавец і русіцыст.

Крыху іншую гісторыю і іншыя ўмовы захаплення гісторыяй Вялікага Княства можна праілюстраваць на прыкладах наступных гераінь.

Сярод патрыярхаў і даследчыкаў Вялікага Княства Літоўскага варта вылучыць кар’еру, уклад у развіццё праблематыкі і ўплыў навуковай

творчасці на наступныя пакаленні гісторыкаў дынастыі і дзяржаўнасці ў эпоху Сярэднявечча ўсяго рэгіёна Цэнтральнай і Усходняй Еўропы Эвы Малечынскай. Прафесар Эва Малечынска, у дзявоцтве Швайгер (Ewa Maleczyńska- Szweiger, 1900–1972), нарадзілася ў Львове, пачала вывучаць гісторыю ва Універсітэце Яна Казіміра, і свой прафесійны шлях распачала асістэнтам на кафедры гісторыі Польшчы ў 1923 г., а ў 1924 г. атрымала доктарскую ступень. Эва Малечынска была вучаніцай прафесара Станіслава Закшэўскага, а таксама свайго мужа Караля Малечынскага. Часам у спісе яе навуковых апекуноў з'яўляецца і імя Людвіга Каланкоўскага.

Перад пачаткам Другой сусветнай вайны Эва Малечынска апублікавала некалькі навуковых прац, прысвечаных дынастычнаму вымярэнню гісторыі рэгіёна, прысвечаных стасункам паміж Ягелонамі і мясцовымі манаршымі дынастыямі [22; 23]. Вясной 1945 г. Эва Малечынска выехала разам з сям'ёй у Кракаў. Калі яе запрасілі ў наступным годзе на новы гістарычны факультэт у Вроцлаўскі ўніверсітэт, яна не адмовілася. І прайшла ўсе прыступкі ўніверсітэцкай кар'еры загадчыка кафедры польскай і ўсеагульнай гісторыі да XV ст. У 1948 г. яна атрымала ступень доктара хабілітаванага на гуманітарным факультэце Універсітэта Мікалая Каперніка ў Торуні. Тэма яе дысертацыі – «Палітычная роля каралевы Соф'і Гальшанскай…». Сярод яе кансультантаў быў Людвіг Каланкоўскі, вядомы спецыяліст па палітычнай гісторыі Вялікага Княства Літоўскага эпохі Ягелонаў.

Даследаванне біяграфіі Соф'і Гальшанскай стане сапраўднай з'явай у даследаванні Ягелонаў у XX ст. і візітнай карткай для самой даследчыцы шырока па-за межамі польскай гістарыяграфіі. Манаграфія, прысвечаная маці Ягелонаў і апошняй жонцы Уладзіслава-Ягайлы, была заснавана на распрацоўках аўтара яшчэ з 1930-х гг., высновы апрабіраваны яшчэ ў львоўскі перыяд [24]. У пасляваеннай Польшчы ўсё гэта ў сукупнасці з гендарнай палітыкай дзяржавы дазволіла Эве Малечынскай атрымаць вышэйшую вучоную ступень.

У вроцлаўскі перыяд навуковай дзейнасці Эва Малечынска была сканцэнтравана на пытаннях кантактаў паміж Польшчай і яе суседзямі, у тым ліку на гусіцкіх адносінах, якія тычыліся і Вялікага Княства, і гісторыі рэгіёна Цэнтральнай і Усходняй Еўропы XV ст. Некаторыя працы былі напісаны разам з мужам – дырэктарам гістарычнага факультэта Вроцлаўскага ўніверсітэта.

Яшчэ адна асоба з групы прафесараў-спецыялістаў па гісторыі Вялікага Княства Літоўскага – Мар'я Барбара Пеховяк-Тапольска (Maria Barbara Piechowiak-Topolska, нарадзілася ў 1938 г.). Была жонкай вядомага польскага гісторыка і метадолага Ежы Тапольскага. Выпускніца Універсітэта імя Адама Міцкевіча ў Познані, вучаніца прафесара Хенрыка Лаўмянскага. Свае навуковыя ступені атрымала ва ўніверсітэце ў Познані адпаведна ў 1966 і 1984 гг. Да 2004 г. акадэмічная кар'ера была звязана з Познанню, а выкладчыцкая з 1997 г. – з Вышэйшай педагагічнай школай у Зялёнай Гуры, дзе прафесар кіравала пяццю доктарскімі дысертацыямі.

Асноўныя навуковыя інтарэсы Мар'і Барбары Тапольскай – культура Вялікага Княства Літоўскага на сучасных літоўскіх, беларускіх і ўкраінскіх землях у XV–XIX стст. Сярод найбольш вядомых прац у гэтым накірунку трэба адзначыць «Шклоўскія маёнткі ва Усходняй Беларусі ў XVII–XVIII ст.», «Чытач і кніга ў Вялікім Княстве Літоўскім у эпоху Рэнесансу і Барока», «Трансфармацыі заходнееўрапейскага культурнага памежжа паміж Бугам ды Дзвіной і Дняпром (польска-літоўска-беларуска-ўкраінскі лёс з XV па XX стст.)», «Агульная ці асобная гісторыя: палякі, літоўцы, беларусы, украінцы ў іх гістарычных узаемасувязях (XV–XX ст.)», «Грамадства і культура ў Вялікім Княстве Літоўскім ад XV да XVIII ст.». За апошнюю прафесар атрымала ўзнагароду Міністэрства народнай адукацыі і вышэйшай школы Польшчы [25–29].

Нарэшце хацелася б прадставіць зусім іншую гісторыю. Гісторыю жыцця Ірэны Гейштар, народжанай Чарнецкай (Irena Gieysztor z domu Czarneckich, 1914–1999), гісторыка дэмаграфіі, складальніка гістарычных атласаў па тэрыторыі Вялікага Княства і Польскага каралеўства. Яна скончыла Гістарычны факультэт Варшаўскага ўніверсітэта, была вучаніцай Марцэлія Хандэльсмана, як і яе муж Аляксандр Гейштар. Перад пачаткам Другой сусветнай вайны яны лічыліся перспектыўнымі польскімі крыніцазнаўцамі і стажыраваліся ў École nationale des chartes у Парыжы [30, с. 61, etc.]. Выжыўшы ў ваенныя гады, сям'я Гейштараў вярнулася ў навуку.

З 1953 г. доктар Ірэна Гейштар працавала ў Інстытуце гісторыі Польскай акадэміі навук. Займалася дэмаграфіяй і картаграфіяй. Сярод яе прац варта звярнуць увагу на «Гістарычны атлас Польшчы», які выдаваўся неаднаразова з 1967 г., і «Уводзіны ў старапольскую дэмаграфію» [31; 32], якія да гэтага часу не страцілі свайго значэння.

У апошнія гады жыцця (з канца 1990-х гг.) Аляксандр Гейштар пачаў займацца гісторыяй Мазовіі, прымаў актыўны ўдзел у развіцці Акадэміі гуманітарных навук у Пултуску, нават перадаў туды сямейную бібліятэку, каб стымуляваць даследаванні гісторыі Мазовіі – навуковага захаплення яго жонкі. Аляксандр і Ірэна памерлі з розніцай у тры месяцы ў 1999 г. і былі пахаваны на могілках Павонзкі ў Варшаве.

Выбраныя персаналіі даследчыц гісторыі Вялікага Княства Літоўскага XX ст. не з'яўляюцца рэпрэзентатыўнай выбаркай жаночых навуковых кар'ер сваёй эпохі. Мэта артыкула – звярнуць увагу на пытанне біяграфіі ў гістарыяграфіі і даследаванне лёсу жанчын у навуцы на прыкладзе вузкай тэматыкі, лакальнага рэгіёна, абставін ваенных міграцый, што, відавочна, не спрые рэалізацыі навукова-творчага патэнцыялу і не дае падстаў да разваг аб гендарнай роўнасці ў бытавых умовах акадэмічных кар'ер XX ст. Пытанні ж аб лёсах сямей гісторыкаў, навуковых дынастыях неразрыўна звязаны з падзеямі XX ст. і рэгіёнам многіх культур – Цэнтральнай і Усходняй Еўропы.

Падобныя сямейныя біяграфіі сустракаюцца і ў іншых галінах навукі і культуры. Аднак хацелася б падкрэсліць, што падчас кардынальных пе-

рамен наймацнейшы чалавек дапамагае і падтрымлівае партнёра, і ў творчасці гэта праяўляецца ў зацменні адной з асоб. Пасля Другой сусветнай вайны жанчыны былі мацнейшыя ў нашай частцы Еўропы.

### Спіс выкарыстаных крыніц


1. *Любый, А. В.* Эпоха Ягеллонов в исследованиях Иоахима Лелявеля / А. В. Любый // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта. – Гродна: ГрДУ, 2023. – № 15. – С. 57–65.

2. *Любы, А. У.* Gloria Jagiellonum familia, даследаванні па гісторыі Вялікага Княства Літоўскага XV–XVI ст. у Беларускім дзяржаўным універсітэце і Універсітэце імя Стэфана Баторыя ў 1920–1930-ыя гг. / А. У. Любы // Вышэйшая школа. – 2022. – № 3. – С. 32–36.

3. Bibliografia zawartości „Ateneum Wileńskiego. Uwagi wstępne / H. Łowmiański, zestawił J. Tumelis // Pamiętnik Biblioteki Kórnickiej. – 1983. – Z. 20. – S. 227−259.

4. *Каханоўскі, Г.* Гістарычныя таварыствы / Г. Каханоўскі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск: БелЭн, 1996. – Т. 3: Гімназіі – Кадэнцыя. – С. 14−15.

5. Początki sowietologii: Instytut Naukowo-Badawczy Europy Wschodniej w Wilnie 1930–1939: idee – ludzie – dziedzictwo: z okazji 90-lecia powołania / redaktorzy tomu Jan Malicki, Andrzej Pukszto. – Warszawa: Studium Europy Wschodniej UW, 2021. – 570 s.

6. *Любы, А. Ул.* Традыцыі вывучэння Вялікага Княства Літоўскага ў Віленскім універсітэце імя Стэфана Баторыя і гістарыяграфія другой паловы XX ст. / А. Ул. Любы // Библиографическое описание источника: Традиции университета: от Франциска Скорины до современности: сб. материалов Междунар. науч. конф., Минск, 26–27 окт. 2017 г. / БГУ; редкол.: С. Н. Ходин [и др.]. – Минск: Изд. центр БГУ, 2017. – С. 150–157.

7. *Aleksandrowicz, S.* Przedmowa / S. Aleksandrowicz // Dwa doktoraty z Uniwersytetu Stefana Batorego w Wilnie. Henryk Łowmiański Wchody miast litewskich, Maria Łowmiańska Wilno przed najazdem moskiewskim 1655 roku. – Poznań: Wydawnictwo Poznańskie, 2005. – S. 7–12.

8. *Łowmiańska, M.* Wilno przed najazdem moskiewskim 1655 roku Wilno / M. Łowmiańska. – Wilno: Wydawnictwo Magistratu m. Wilna; Warszawa: skł. gł. w Domu Książki Polskiej, 1929. – 198, [3] s.

9. *Łowmiańska, M.* W sprawie składu narodowościowego Cechów Wileńskich: w XVI–XVIII / M. Łowmiańska. – Wilno: Druk. “Znicz”, 1930. – 5 s.

10. *Łowmiańska, M.* Dokumenty do historii kamienic, przeznaczonych na chowanie Metryki W. Ks. L. (1588–1712) / M. Łowmiańska // Ateneum Wileńskie. – 1930. – № 7. – S. 293–311.

11. *Łowmiańska, M.* Hrehory Ościk i jego zdrada w roku 1580 / M. Łowmiańska. – Wilno: Druk. Lux, 1933. – 22 s.

12. *Pietkiewicz, K.* Od wydawca / K. Pietkiewicz // Polityka Jagiellonów / Henryk Łowmiański; do dr. przygot. Krzysztof Pietkiewicz. – Poznań: Wyd. Poznańskie, 1999. – S. I–XII.

13. *Kosman, M.* Szkic do portretu Uczonego / M. Kosman // Prusy – Litwa – Krzyżacy / Henryk Łowmiański; wyboru dokonał, oprac., wstępem i posłowiem opatrzył Marceli Kosman. – Warszawa: Państwowy Instytut Wydawniczy, 1989. – S. 5–34.

14. Przedmowa // Zaludnienie Państwa Litewskiego w wieku XVI: zaludnienie w roku 1528 / Henryk Łowmiański; do dr. przygot. Artur Kijas i Krzysztof Pietkiewicz. – Poznań: Wyd. Poznańskie, 1998. – S. 5–8.

15. *Witkowski, R.* Nota od wydawcy / R. Witkowski // Dwa doktoraty z Uniwersytetu Stefana Batorego w Wilnie. Henryk Łowmiański Wchody miast litewskich, Maria Łowmiańska Wilno przed najazdem moskiewskim 1655 roku. – Poznań: Wyd. Poznańskie, 2005. – S. 13–17.

16. *Śreniowska, K.* Zwolska Wanda / K. Śreniowska // Słownik historyków polskich. – Warszawa, 1994. – S. 583–584.

17. *Dąbrowska, M.* Fiszka Zwolskiego Bogumił Zwolski na Uniwersytecie Łódzkim (1945–1979) / M. Dąbrowska // Przegląd nauk historycznych. – 2015. – R. XIV. – № 2. – S. 255–267.

18. *Puciatowa, M.* Dzieje Komisji skarbu Rzeczpospolitej W. Ks. Litewskiego za rządów targowickich i sejmu grodzieńskiego / M. Puciatowa // Księga pamiątkowa Koła Historyków Słuchaczy Uniwersytetu Stefana Batorego w Wilnie 1923–1933. – Wilno: Zrzeszenie Kół Naukowych, 1933. – S. 189–204.

19. Pracownicy nauki i dydaktyki Uniwersytetu Mikołaja Kopernika 1945–2004. Materiały do biografii / Kalembka S. (red.). – Toruń: Wydawnictwo Uniwersytetu Mikołaja Kopernika, 2006ю – S. 574.

20. *Kozłowski, M.* Nauczyciel i wychowawca. O uczniach Stanisława Kościałkowskiego / M. Kozłowski // Stanisław Kościałkowski pamięci przywrócony / red. Małgorzata Dąbrowska. – Warszawa–Łódź: IPN, 2016. – S. 130–179.

21. *Zwolski, B.* Wykaz tematów prac doktorskich oraz prac magisterskich i nauczycielskich w zakresie historii, przyjętych w latach 1923–1933 przez komisję Egzaminacyjną Wydz. Humanistycznego U.S.B. / B. Zwolski // Księga pamiątkowa Koła Historyków Słuchaczy Uniwersytetu Stefana Batorego w Wilnie 1923–1933. – Wilno: Zrzeszenie Kół Naukowych, 1933. – S. 368.

22. *Maleczyńska, E.* Książęce lenno mazowieckie 1351–1526 / E. Maleczyńska. – Lwów: nakł. Towarzystwa Naukowego, 1929. – 160 s.

23. *Maleczyńska, E.* Społeczeństwo polskie pierwszej połowy XV wieku wobec zagadnień zachodnich: studia nad dynastyczną polityką Jagiellonów / E. Maleczyńska. – Wrocław: nakł. Wrocławskiego Towarzystwa Naukowego: Skład Główny w Księgarni J. Lacha, 1947. – 163, [1] s.

24. *Maleczyńska, E.* Rola polityczna królowej Zofii Holszańskiej na tle walki stronnictw w Polsce w latach 1422–1434 / E. Maleczyńska. – Lwów: Towarzystwo Naukowe, 1936. – 118, [1] s.

25. *Topolska, M. B.* Dobra szkłowskie na Białorusi Wschodniej w XVII i XVIII wieku / M. B. Topolska. – Warszawa: Państ. Wydaw.Naukowe, 1969. – 163 s.

26. *Topolska, M. B.* Czytelnik i książka w Wielkim Księstwie Litewskim w dobie Renesansu i Baroku / M. B. Topolska. – Wrocław: Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1984. – 337, [2] s.

27. *Topolska, M. B.* Społeczeństwo i kultura w Wielkim Księstwie Litewskim od XV do XVIII wieku / M. B. Topolska. – Poznań: Wydaw. Naukowe; Zielona Góra: dystr. Oficyna Wydawnicza Uniwersytetu Zielonogórskiego, 2002. – 448 s.

28. *Topolska, M. B.* Przemiany zachodnioeuropejskiego pogranicza kulturowego pomiędzy Bugiem a Dźwiną i Dnieprem: polsko-litewsko-białorusko-ukraińskie losy od XV do poczatku XX wieku: kurs 14 wykładów / M. B. Topolska. – Zielona Góra: Oficyna Wydawnicza Uniwersytetu Zielonogórskiego, 2009. – 498 s.

29. *Topolska, M. B.* Historia wspólna czy rozdzielna: Polacy, Litwini, Białorusini, Ukraińcy w ich dziejowym stosunku (XV–XX w.) / M. B. Topolska. – Toruń: Oficyna Wydawnicza Kucharski, 2015. – 380 s.

30. Opowieść o Aleksandrze Gieysztorze / Robert Jarocki. – Warszawa: Fundacja Bankowa im. Leopolda Kronenberga: Rzeczpospolita, 2001. – 359 s.

31. Atlas historyczny Polski / I. Gieysztor [et al.]; red. W. Czapliński, T. Ładogórski. – Warszawa: Państwowe Przedsiębiorstwo Wydawnictw Kartograficznych, 1967, etc. – 54, 55 s.: mapy.

32. Wstęp do demografii staropolskiej / I. Gieysztorowa; Polska Akademia Nauk. Instytut Historii. – Warszawa: Państwowe Wydaw. Naukowe, 1976. – 310 s.

**(Дата падачы: 26.02.2024 г.)**

*И. А. Макаренко*
Республиканский центр экологии и краеведения, Минск

*I. Makarenko*
Republican Center of Ecology and Local Lore, Minsk

**УДК [94:297.014] (410) «1997/2010»**

# РЕЛИГИОЗНЫЙ ФАКТОР В КОНТЕКСТЕ МУЛЬТИКУЛЬТУРНОЙ ОБРАЗОВАТЕЛЬНОЙ ПОЛИТИКИ В ВЕЛИКОБРИТАНИИ (1997–2010 ГГ.)

# THE RELIGIOUS FACTOR IN THE CONTEXT OF MULTICULTURAL EDUCATIONAL POLICY IN THE UK (1997–2010)

*В статье проанализированы мероприятия лейбористских правительств Т. Блэра и Г. Брауна в рамках проводимой ими религиозной политики в отношении учреждений общего среднего образования. Раскрыты ключевые тенденции данной политики в контексте британского мультикультурализма. На основе широкой гаммы источников дана оценка работы этих учебных заведений со стороны британской общественности. Установлено, что вышеназванная политика оказалась не вполне состоятельной.*

*Ключевые слова: Великобритания; «новые лейбористы»; школьное образование; религиозные школы; мультикультурализм; христианство; ислам; индуизм.*

*The article analyzes the activities of the Labour governments of T. Blair and G. Brown within the framework of their religious policy towards institutions of general secondary education. The key trends of this policy in the context of British multiculturalism are revealed. Based on a wide range of sources, an assessment of the work of these educational institutions by the British public is given. It is established that the above-mentioned policy turned out to be not completely sound.*

*Keywords: Great Britain; New Labour; schooling; religious schools; multiculturalism; Christianity; Islam; Hinduism.*

В современном обществе мультикультурной политике отводится важная роль не только на региональном, но и на глобальном уровне. На наш взгляд, теоретическое осмысление феномена мультикультурализма представляется необходимым в свете социально-политических событий последнего